# НОВАЯ СТАРОНКА Ў ГІСТОРЫІ ШКОЛЫ

**Новая школа на 1020 месцаў прыняла сваіх першых вучняў у Крычаве, у мікрараёне Камсамольскі. Ва ўрачыстай цырымоніі адкрыцця ўзялі ўдзел намеснік прэм'ер-міністра Беларусі Анатоль КАЛІНІН і старшыня Магілёўскага аблвыканкама Уладзімір ДАМАНЕЎСКІ.**



Фота БЕЛТА.

Губернатар назваў новую школу знакавым аб'ектам для рэгіёна і Крычаўскага раёна. Новая ўстанова адукацыі пабудавана побач з пляцоўкай, дзе знаходзілася старая гімназія, у якой тры гады таму напярэдадні новага навучальнага года абрынулася частка будынка. Яе ацалелыя карпусы пасля даследавання спецыяльнай камісіі былі прызнаныя ўзведзенымі з парушэннямі будаўнічых нормаў, або аварыйнымі. Таму было прынята рашэнне не аднаўляць стары будынак, а будаваць новы. Фінансавалася будаўніцтва за кошт сродкаў рэспубліканскага і абласнога бюджэтаў. На гэтыя мэты было выдзелена больш за 23 мільёны рублёў.

— Сёння для жыхароў Крычава двайное свята. У Дзень ведаў адкрываем новую старонку сваёй гісторыі СШ №8, — адзначыў Анатоль Калінін. — Урад і губернатар стрымалі слова. За кароткі тэрмін быў узведзены будынак, які адпавядае ўсім сучасным патрабаванням: школа аснашчана камп'ютарным і інтэрактыўным абсталяваннем, тут створана безбар'ернае асяроддзе і развіта спартыўная інфраструктура.

У новым навучальным годзе ў школе будуць вучыцца амаль тысяча хлопчыкаў і дзяўчат. Тут адкрыты чатыры першыя класы. Педкалектывам было прынята рашэнне аб адкрыцці профільных класаў з паглыбленым вывучэннем матэматыкі, фізікі, англійскай, нямецкай моў, біялогіі і хіміі.

У школе ўкаранёная сучасная сістэма электроннага доступу. Ёсць спартыўная, гімнастычная і трэнажорная залы, тры камп'ютарныя класы. Паколькі школа знаходзіцца ў вялікім спальным мікрараёне, праекціроўшчыкі прадугледзелі спартыўныя і дзіцячыя гульнявыя пляцоўкі, бегавыя дарожкі. На фінішную прамую выйшлі работы і па будаўніцтве басейна. Яго плануецца ўвесці ў строй у кастрычніку.

Першых вучняў у Дзень ведаў прыняла таксама школа-навабудоўля ў мінскім мікрараёне Дамброўка. Сярэдняя школа №41, размешчаная па вуліцы Гаруна, разлічана на 1020 месцаў.

**Надзея НІКАЛАЕВА.**
*nikalaeva@zviazda.by*

■ Харчовая бяспека

# БУЛЬБА ЎРАДЗІЛА,

## ды і з яблыкамі не так кепска...

**Ураджай нашага другога хлеба і аб'ёмы агароднiны даваляюць забяспечыць унутрырэспубліканскія патрэбы, у першую чаргу ажыццявіць закладку ў стабілізацыйныя фонды на міжсезонны перыяд 2017—2018 гадоў, паведаміла намеснік начальніка галоўнага ўпраўлення раслінаводства Міністэрства сельскай гаспадаркі і харчавання Таццяна КАРБАНОВІЧ.**

Чаканыя аб'ёмы гэтага года якраз цалкам забяспечаць закладку ў стабфонды. «Акрамя таго, ураджай дазваляе выканаць дагаворныя абавязацельствы па пастаўках прадукцыі на экспарт», — сказала Таццяна Карбановіч.

### Ураджайнасць каля 310 цэнтнераў

У сельгасарганізацыях і сялянскіх фермерскіх гаспадарках ужо сабрана каля 95 тысяч тон агароднiны, каля дзвюх тысяч тон пладоў і ягад. Ідзе копка бульбы — пакуль на 3% плошчаў сабрана ўжо 28 тысяч тон. Сярэдняя ўраджайнасць складае 307 ц/га.

Таццяна Карбановіч адзначыла, што ў краіне ў апошнія гады істотна пашыраны асартымент пладова-ягадных культур, а ў цяперашні час ён дасягае больш як 40 найменняў. Сёлета ў сельгасарганізацыях краіны і сялянскіх фермерскіх гаспадарках плануецца атрымаць больш за 1,1 млн тон бульбы, 528 тысяч тон агароднiны, пладоў і ягад — 102—105 тысяч тон. У гаспадарках усіх катэгорый чаканае вытворчасць бульбы — 5,7 млн тон, агароднiны — 1,7 млн тон, пладоў і ягад — 480 тысяч тон.

З пачатку года мы прадалі за мяжу 189 тысяч тон бульбы. З іх каля 10 тысяч тон — новага ўраджаю. «Цяпер ідзе адгрузка ранняй прадукцыі на экспарт. Каб яна захоўвалася практычна да наступнага ўраджаю, у краіне створаны спецыялізаваныя сховішчы: бульбасховішча ёмістасцю 829 тысяч тон, агароднінасховішча ёмістасцю 148 тысяч тон, пладасховішчы — 102 тысячы тон. Так мы можам прадаваць прадукцыю тады, калі складваюцца найбольш выгадныя цэны», — заявіла Таццяна Карбановіч.

Акрамя таго, сёння ў Беларусі створана больш за 200 спецыялізаваных буйнатаварных арганізацый па развіцці бульбаводства, больш за 70 арганізацый — па агародніцтве, 150 арганізацый — па пладах і ягадах. Яны маюць гарантаваныя ўраджаі і экспартны патэнцыял, у іх ёсць адпаведная матэрыяльна-тэхнічная база, сховішчы. «Пералік гэтых арганізацый мы рэгулярна друкуем у Міністэрстве антыманапольнага рэгулявання і гандлю, даём у Белкаапсаюз, Белдзяржхарчпрам, каб можна было заключаць з імі дагаворы па вытворчасці прадукцыі», — сказала прадстаўнік упраўлення раслінаводства.

### Рэха веснавых замаразкаў

Калі казаць увогуле па краіне, то ўраджай яблыкаў сёлета дасць магчымасць забяспечыць патрэбнасці ўнутранага рынку, паведаміла **загадчыца аддзела інфармацыі, маркетынгу і ўкаранення Інстытута пладаводства Наталля КАРТАВІЦКАЯ.**

Паводле слоў спецыяліста, надвор'е ўнесла свае карэктывы. «Па сітуацыі ў садах нашага інстытута можна зрабіць высновы, што ўраджай яблыкаў зараз меншы за леташні, але ён не крытычны. Яго цалкам дастаткова для забеспячэння ўнутранага рынку. І думаю, як і ў мінулым годзе, мы працягнем пастаўляць яблыкі на экспарт», — адзначыла Наталля Картавіцкая.

Пры гэтым **начальнік упраўлення харчовых тавараў галоўнага ўпраўлення рэгулявання спажывецкага рынку Міністэрства антыманапольнага рэгулявання і гандлю (МАРГ) Таццяна КРАСНЮК** звярнула ўвагу, што ў краіне неабходна наладзіць больш цеснае ўзаемадзеянне вытворцаў яблыкаў (сельгасарганізацый, фермерскіх гаспадарак) і гандлю. «Мы прадалі за першае паўгоддзе праз арганізацыі гандлю 53 тысячы тон яблыкаў, з іх айчынных — толькі 16%, — кажа яна. У стабфонды плануем закласці каля 14—16 тысяч тон. Таму на працягу міжсезоннага перыяду беларускімі яблыкамі мы забяспечаны, яны ў абавязковым парадку павінны ляжаць на паліцах».

### З 15 верасня — на кірмаш

У сезон масавай уборкі ўраджаю арганізоўюцца сельскагаспадарчыя кірмашы. Сялянскім фермерскім гаспадаркам, сельгасвытворцам для рэалізацыі прадукцыі вылучаюцца пляцоўкі ў жылых мікрараёнах гарадоў. Акрамя таго, выдзяляюцца пляцоўкі для выязнога гандлю спажыўкааперацыі. «Кірмашы пачынаюцца з 15 верасня і будуць працягвацца да кастрычніка — лістапада ў залежнасці ад умоў надвор'я», — растлумачыла Таццяна Краснюк. У сталіцы нашай краіны першы кірмаш пройдзе 16 верасня на пляцоўцы каля «Чыжоўка-Арэны». Аналагічныя мерапрыемствы будуць арганізаваныя на пляцоўцы каля Палаца спорту 30 верасня, 1, 7 і 8 кастрычніка.

### Запас бяды не чыніць

Для забеспячэння насельніцтва агароднінай у міжсезонне да 15 лістапада ў абласцях і Мінску будуць створаны стабілізацыйныя фонды прадуктаў раслінаводства. Традыцыйна на захоўванне закладваецца бульба, капуста, буракі, морква, цыбуля, яблыкі айчыннай вытворчасці. «Умовы для закладкі ёсць. Аб'ёмы прадукцыі будуць закладзены не ніжэй за ўзровень мінулага года, зацвердзіць іх плануецца да 1 верасня», — паведаміла начальнік упраўлення МАРГ. Паводле яе слоў, іх міністэрства рэкамендуе перагледзець гэтыя аб'ёмы ў бок павелічэння.

На ўнутраны рынак краіны штогод пастаўляецца каля 320—330 тысяч тон свежай агароднiны, 160 тысяч тон бульбы, 370 тысяч тон садавіны, пладоў і ягад. «Патрэба ў свежай агародніне задавальняецца часцей за ўсё за кошт беларускай прадукцыі. У гандлёвых сетках удзельная вага продажу свежай беларускай бульбы складае 93%, капусты — 72%, буракоў — 96%, морквы — 89%, агуркоў — 89%. Па садавіне і ягадах удзельная вага айчыннай прадукцыі складае толькі 8,4% з прычыны кліматычных умоў, але мы гэтую сітуацыю стараемся выправіць — штогод высаджваюцца сады, пашыраюцца ягаднікі», — сказала Таццяна Краснюк.

**Сяргей КУРКАЧ.**
*kurkach@zviazda.by*


**ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ОТКРЫТЫХ АУКЦИОНОВ ПО ПРОДАЖЕ ЗЕМЕЛЬНЫХ УЧАСТКОВ В ЧАСТНУЮ СОБСТВЕННОСТЬ**

**Организатор:** государственное предприятие «Витебский областной центр маркетинга», 210015, г. Витебск, проезд Гоголя, дом 5, тел. (0212) 42-61-62

| **Кадастровый номер, площадь, адрес, функциональное назначение земельного участка** |
|---|
| **Лот №1.** Земельный участок с кадастровым №221281201101000517, площадью 0,1494 га по адресу: Витебская обл., Витебский р-н, Вороновский с/с, аг. Вороны, ул. Ленинская, У-4 для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома. Ограничения, инженерные коммуникации и сооружения: отсутствуют. **Начальная цена**: 4 423,44 бел. руб. **Размер задатка:** 442,34 бел. руб. **Реквизиты для внесения задатка:** р/с BY89AKBB36003140200420000000 ОАО «АСБ Беларусбанк», БИК AKBBBY2X, УНП 300594330, код платежа 04901, получатель платежа: ГУ МФ РБ по Витебской области (Вороновский сельсовет) |
| **Лот №2.** Земельный участок с кадастровым №221281201101000516, площадью 0,1305 га по адресу: Витебская обл., Витебский р-н, Вороновский с/с, аг. Вороны, ул. Садовая, У-9 для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома. Ограничения, инженерные коммуникации и сооружения: отсутствуют. **Начальная цена**: 3 863,85 бел.руб. **Размер задатка:** 386,38 бел. руб. **Реквизиты для внесения задатка:** р/с BY89AKBB36003140200420000000 ОАО «АСБ Беларусбанк», БИК AKBBBY2X, УНП 300594330, код платежа 04901, получатель платежа : ГУ МФ РБ по Витебской области (Вороновский сельсовет) |
| **Лот №3.** Земельный участок с кадастровым №221287005101000109, площадью 0,1332 га по адресу: Витебская обл., Витебский р-н, Новкинский с/с, д. Городняны, участок №1 для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома. Ограничения, инженерные коммуникации и сооружения: водоохранная зона рек и водоемов (оз. Городно). **Начальная цена**: 2 654,37 бел. руб. **Размер задатка:** 265,43 бел. руб. **Реквизиты для внесения задатка:** р/с BY85AKBB36003141001190000000 ОАО «АСБ Беларусбанк», БИК AKBBBY2X, УНП 300594330, код платежа 04901, получатель платежа : ГУ МФ РБ по Витебской области (Новкинский сельсовет) |
| **Лот №4.** Земельный участок с кадастровым №221287005101000110, площадью 0,1341 га по адресу: Витебская обл., Витебский р-н, Новкинский с/с, д. Городняны, участок №2 для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома. Ограничения, инженерные коммуникации и сооружения: водоохранная зона рек и водоемов (оз. Городно). **Начальная цена**: 2 672,31 бел. руб. **Размер задатка:** 267,23 бел. руб. **Реквизиты для внесения задатка:** р/с BY85AKBB36003141001190000000 ОАО «АСБ Беларусбанк», БИК AKBBBY2X, УНП 300594330, код платежа 04901, получатель платежа : ГУ МФ РБ по Витебской области (Новкинский сельсовет) |
| **Дата, время и место проведения аукциона:** 05.10.2017 г. в 15.00 по адресу: г. Витебск, проезд Гоголя, 5 в ККУП «Витебский областной центр маркетинга». **Срок внесения задатка и приема документов:** с 04.09.2017 г. с 8.30 по 04.10.2017 г. до 17.30 по адресу: г. Витебск, проезд Гоголя, 5 в ККУП «Витебский областной центр маркетинга» в рабочие дни с 8.30 до 17.30. **Условия аукциона:** в двухмесячный срок со дня утверждения в установленном порядке протокола о результатах аукциона либо после признания аукциона несостоявшимся обратиться в РУП «Витебское агентство по гос. регистрации и зем. кадастру» за гос. регистрацией прав, ограничений (обременений) прав на зем. участок; получить в установленном порядке разрешение Витебского районного исполнительного комитета на проведение проектно-изыскательских работ и разработать проект на строительство объекта в срок не превышающий двух лет; в течение 1 года со дня утверждения в установленном порядке проектной документации на строительство объекта приступить к занятию зем.участка в соответствии с целью и условиями его предоставления; осуществить строительство объекта в сроки, определенные ПСД; снять, сохранить и использовать плодородный слой почвы согласно ПСД |

| **Кадастровый номер, площадь, адрес, функциональное назначение земельного участка** |
|---|
| **Лот №1.** Земельный участок с кадастровым №221586004601000019, площадью 0,2500 га по адресу: Витебская обл., Глубокский р-н, Псуевский с/с, д. Заозерная, ул. Драчинская, 10 для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома. Ограничения, инженерные коммуникации и сооружения: водоохранная зона рек и водоемов (оз. Долгое), охранная зона электрических сетей напряжением до 1000 В. **Начальная цена**: 2 000 руб. **Размер задатка:** 200 руб. |
| **Лот №2.** Земельный участок с кадастровым №221586004601000020, площадью 0,1833 га по адресу: Витебская обл., Глубокский р-н, Псуевский с/с, д. Заозерная, ул. Драчинская, 14 для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома. Ограничения, инженерные коммуникации и сооружения: водоохранная зона рек и водоемов (оз. Долгое). **Начальная цена**: 2 000 руб. **Размер задатка:** 200 руб. |
| **Лот №3.** Земельный участок с кадастровым №221586004601000021, площадью 0,1541 га по адресу: Витебская обл., Глубокский р-н, Псуевский с/с, д. Заозерная, ул. Драчинская, 16 для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома. Ограничения, инженерные коммуникации и сооружения: водоохранная зона рек и водоемов (оз. Долгое). **Начальная цена**: 2 000 руб. **Размер задатка:** 200 руб. |
| Лот №4. Земельный участок с кадастровым №221586004601000022, площадью 0,2217 га по адресу: Витебская обл., Глубокский р-н, Псуевский с/с, д. Заозерная, ул. Драчинская, 18 для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома. Ограничения, инженерные коммуникации и сооружения: водоохранная зона рек и водоемов (оз. Долгое). **Начальная цена**: 2 000 руб. **Размер задатка:** 200 руб. |
| **Дата, время и место проведения аукциона:** 04.10.2017 в 15.00 по адресу: Витебская обл., г. Глубокое, ул. Ленина, 42, в Глубокском райисполкоме. **Срок внесения задатка и приема документов:** с 04.09.2017 г. с 8.30 по 03.10.2017 г. до 17.30 по адресу: г. Витебск, проезд Гоголя, 5 в ККУП «Витебский областной центр маркетинга» в рабочие дни с 8.30 до 17.30. **Условия аукциона:** осуществить в двухмесячный срок со дня утверждения протокола аукциона гос. регистрацию прав, ограничений прав на зем. участок; получить в установленном порядке проектную документацию и разрешение на строительство одноквартирного жилого дома; приступить к занятию зем. участка не позднее 1 года после гос. регистрации создания зем. участка и возникновения права на него в соответствии с целью и условиями его предоставления; после получения разрешения на строительство одноквартирного жилого дома снять на зем.участке плодородный слой почвы из-под пятен застройки и использовать его для благоустройства участка. **Реквизиты для внесения задатка:** р/с BY15AKBB36003151165220000000 ОАО «АСБ Беларусбанк», БИК AKBBBY2X, УНП 300594330, код платежа 04901, получатель платежа: ГУ МФ РБ по Витебской области (Псуевский сельсовет) |

| **Кадастровый номер, площадь, адрес, функциональное назначение земельного участка** |
|---|
| **Лот №1.** Земельный участок с кадастровым №221887001601000125, площадью 0,1496 га по адресу: Витебская обл., Городокский р-н, Пальминский с/с, д. Ботали, пер. Седьмой, 5 для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома. Ограничения, инженерные коммуникации и сооружения: водоохранная зона рек и водоемов (оз. Лосвидо). **Начальная цена**: 2 000 руб. **Размер задатка:** 200 руб. |
| **Лот №2.** Земельный участок с кадастровым №221887001601000124, площадью 0,1500 га по адресу: Витебская обл., Городокский р-н, Пальминский с/с, д. Ботали, пер. Седьмой, 3 для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома. Ограничения, инженерные коммуникации и сооружения: водоохранная зона рек и водоемов (оз. Лосвидо). **Начальная цена**: 2 000 руб. **Размер задатка:** 200 руб. |
| **Дата, время и место проведения аукциона:** 06.10.2017 г. в 15.00 по адресу: Витебская обл., г. Городок, ул. Пролетарская, 2, в Городокском райисполкоме. **Срок внесения задатка и приема документов:** с 04.09.2017 г. с 8.30 по 05.10.2017 г. до 17.30 по адресу: г.Витебск, проезд Гоголя, 5 в ККУП «Витебский областной центр маркетинга» в рабочие дни с 8.30 до 17.30. **Условия аукциона:** обращение в течение 2 месяцев со дня утверждения в установленном порядке протокола о результатах аукциона либо несостоявшегося в Городокское бюро РУП «Витебское агентство по гос. регистрации и зем. кадастру» за гос. регистрацией зем. участка; разработка на основании утвержденного акта выбора места размещения зем. участка с соблюдением требований градостроительного паспорта проектной документации на строительство жилого дома и согласование ее с главным архитектором района (начальником отдела архитектуры и строительства Городокского райисполкома), получение разрешения на строительство; занятие зем. участка в течение года со дня получения свидетельства (удостоверения) о гос. регистрации в соответствии с целью и условиями его предоставления (начать строительство, иное освоение земель); снятие из-под пятен застройки плодородного слоя почвы и использования его для благоустройства придомовой территории. **Реквизиты для внесения задатка:** р/с BY82AKBB36003160870090000000 ОАО «АСБ Беларусбанк», БИК AKBBBY2X, УНП 300594330, код платежа 04901, получатель платежа: ГУ МФ РБ по Витебской области (Пальминский сельсовет) |

Аукционы проводятся в порядке, установленном Постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 26.03.2008 №462. Для участия в аукционе приглашаются граждане РБ, консолидированные участники (двое и более граждан РБ). **Для участия в аукционе** граждане РБ подают заявление об участии в аукционе, представляют документ, подтверждающий внесение суммы задатка на р/счет, указанный в извещении, с отметкой банка, заключают с организатором аукциона соглашение о правах, обязанностях и ответственности сторон в процессе подготовки и проведения аукциона. Представляются: гражданином – копия документа, содержащего его идентификационные сведения, без нотариального засвидетельствования; представителем гражданина – нотариально удостоверенная доверенность; консолидированными участниками – оригинал и копия договора о совместном участии в аукционе. При подаче документов на участие в аукционе граждане предъявляют паспорт гражданина РБ, представители граждан, уполномоченные лица (представители) – документ, удостоверяющий личность, и доверенности, выданные в установленном законодательством порядке. **Условия аукциона: победитель аукциона, единственный участник несостоявшегося аукциона обязан:** в течение 10 рабочих дней со дня утверждения протокола о результатах аукциона внести плату за зем. участок и возместить затраты на организацию и проведение аукциона в т. ч. расходы, связанные с изготовлением и представлением участникам аукциона документации, необходимой для его проведения; обратиться за гос. регистрацией права на зем. участок в двухмесячный срок со дня проведения аукциона (утверждения протокола о результатах аукциона либо признания аукциона несостоявшимся). Условия инженерного развития инфраструктуры застраиваемой территории устанавливаются проектной документацией. Назначение зем. участков в соответствии с единой классификацией назначения объектов недвижимого имущества: 1 09 02 – зем. участок для размещения объектов усадебной застройки (строительства и обслуживания жилого дома, обслуживания зарегистрированной организацией по гос. регистрации недвижимого имущества, прав на него и сделок с ним квартиры в блокированном жилом доме). Аукцион состоится при наличии не менее 2-х участников. Победитель аукциона – участник, предложивший наибольшую цену. Всем участникам предоставляется право ознакомления с земельно-кадастровой документацией, а также возможность осмотра на местности зем. участка. **Конт. тел.: (0212) 42-61-62, (029) 510-07-63; e-mail: vcm74@mail.ru; www.marketvit.by**